Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №4(55), Ч1, 2009

*УДК 947.6 "18" : 323.14 (476) (=162.1)*

# Польская грамадскасць на беларускіх землях у XIX стагоддзі: ад *GENTE LITHUANUS (RUTHENUS), NATIONE POLONUS* да паляка-нацыяліста (каталіка)

Р. Радзік

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У нацыятворчых працэсах на беларускіх землях у дзевятнаццатым стагоддзі істотную ролю адыгралі тры асноўныя кірункі эвалюцыі польскай грамадскасці, абмежаванай, у нашым выпадку, перад усім шляхтай і людзьмі шляхецкага паходжання – пры тагачасным палітычным, прынцыпова адрозным ад сучаснага і ўзятым з І Рэчы Паспалітай, разуменні польскай нацыі. З часам на яе месцы на тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага паўсталі тры моўна-этнічныя (культурныя) нацыі, у якія ўваходзілі не толькі эліты, але і просты народ: беларускі, літоўскі, польскі. Па-першае, у разгляданым перыядзе адбыўся пераход ад свядомасці *gente Lithuanus (Ruthenus), natione Polonus* – да самаўсведамлення (выразнага толькі пасля 1905 года, асабліва ў ідэалогіі нацыянальных дэмакратаў) у катэгорыях паляка-каталіка і паляка-нацыяналіста. Па-другое, у свядомасці мясцовай польскай грамадскасці адбыўся пераход ад айчыны малой (навакольнай, вядомай з асабістага, непасрэднага досведу), рэгіянальнай (земляў былога Вялікага Княства Літоўскага) і ідэалагічнай у традыцыйным сэнсе (палітычна-феадальнай, зведзенай у грамадскім разуменні да шляхецкага стану) – да ідэалагічнай айчыны ў навачасным разуменні нацыі як культурнай супольнасці, што ахоплівае ўсе сацыяльныя пласты. Па-трэцяе, эвалюцыя ад палітычнай да культурнай нацыі у сярэднееўрапейскіх умовах фармавання нацыянальных рухаў найчасцей значыла пераход ад шляхты (пласта, што вызначаў гэтыя рухі раней) да інтэлігенцыі (пласта з нацыятворчай і культуратворчай функцыямі). Далей будуць абмеркаваны тры названыя кірункі эвалюцыі польскай грамадскасці на беларускіх землях у XIX стагоддзі. Акрэсленыя тут з'явы маюць моцную сувязь з працэсамі, разгляданымі на гомельскай канферэнцыі два гады таму – такім чынам, цяперашнія развагі выступаюць у працяг папярэдняга тэксту [1, с. 46–52].

Знаўца гісторыі Вялікага Княства Літоўскага Уладыслаў Вяльгорскі, разбіраючы развіццё адносін паміж ліцвінамі, беларусамі і палякамі на тых землях, а асабліва нацыянальную эвалюцыю свядомасці гэтых супольнасцяў у перыяд падзелаў, пісаў, што "да ацэнкі разгляданага мінулага нельга падыходзіць праз крытэрыі сучасных паняццяў і нацыянальных ці грамадскіх памкненняў. Бо тады гісторыя, дастасаваная да паказнікаў цяперашняга часу, робіцца незразумелай" [2, с. 153]. Аднолькавым паводле гучання нацыянальным тэрмінам сёння надаецца іншы, чым некалі, змяст. Гэта датычыць, сярод іншага, такога паняцця, як «літвін», за якім на літоўска-беларускіх землях не стаяла, прынамсі да студзеньскага паўстання, нічога няпольскага (ці ў цяперашніх катэгорыях – небеларускага). Паняцце польскасці мела ў тыя часы іншы змест, чым цяпер. Згодна з мысленнем у катэгорыях «роду літоўскага, нацыі польскай» паняцце «літвін» было вузейшым за паняцце «паляк». Як зазначае Юлюш Бардах, "у выніку моўна-культурнай асіміляцыі тэрмін «паляк», які ў XVI ст. выразна разводзіўся з «літвінам», у XVIII стагоддзі стаўся сінонімам грамадзяніна ўсёй Рэчы Паспалітай" [3, с. 38]. Разам з тым, "факт адданасці мінуўшчыне Вялікага Княства істотным чынам адрозніваў літоўскіх палякаў ад каронных" [3, с. 39].

Такі спосаб самавызначэння характарызаваў шляхту, якая апошнімі дзесяцігоддзямі XVIII стагоддзя ў сваіх найбольш адукаваных і актыўных асяродках, разам з прадстаўнікамі нешматлікага тады мяшчанства, звярталася да асветніцкай ідэі палітычнага нацыянальнага згуртавання ўсіх земляў Рэчы Паспалітай – у абыход станавых бар'ераў «шляхецкай нацыі». Літвінамі лічыліся тыя, хто паходзіў з грамадства Вялікага Княства Літоўскага, не зважаючы

на этнічна-культурныя падзелы. Літоўскай, такім чынам, была шляхта як з этнічна літоўскіх, так і беларускіх родаў, што ўсіх сваіх сялян, незалежна ад мовы і веры, лічыла літвінамі[4]. Літоўскасць значыла радавае паходжанне, сувязь з краем, яго грамадствам, гісторыяй, прыродай, мясцовымі групоўкамі. Вяльгорскі піша нават пра "пачуццё біялагічнай, прыроднай адметнасці літвінаў, адрозных ад каронных палякаў паводле свайго характару [2, с. 151]. "Вайніловічы, сцвярджае прадстаўнік роду, не прыйшлі з Усходу ці Захаду, яны спрадвечныя, мясцовыя, кроў ад крыві, костка ад косткі таго люду, які некалі хавалі ў тых курганах, а цяпер на вясковых могілках, які родную беларускую зямлю сахой кроіць" [5, с. VIII]. Гэта не значыць, што літоўска-беларускія землі засяляла толькі шляхта з мясцовых родаў і мысленнем у катэгорыях «gente Lithuani, natione Poloni». Аднак шляхта, прыйшлая звонку, з часам, прынамсі часткова, прыпадабнялася літоўскай (у палітычным значэнні).

"Я нарадзіўся літвінам", – у 1815 годзе пісаў Касцюшка, які ў той самы час лічыўся палякам[1]. Літвінамі ў такім значэнні лічыліся Міцкевіч, Крашэўскі, Ліманоўскі, а таксама – Пілсудскі. Ю. Бардах сцвярджае: "У перыяд пасля паўстання Ліманоўскі *[паходзіў з Інфлянтаў – РР]* вызначаўся як паляк, але захаваў шмат сантыментаў да Літвы" [6, с. 205]. Гэта зусім не значыць, што 1863 год быў датай рэзкага падзелу дзвюх эпох, з гледзішча карыстанай нацыянальнай тэрміналогіі, зместу ўжываных паняццяў ды атаясамлення сябе з пэўнымі групоўкамі. Часам адны і тыя ж людзі вызначалі сябе па-рознаму ў розныя перыяды свайго жыцця. Найчасцей гэта не сведчыла пра нацыянальнае адступніцтва. Не было яго і ў выпадку Ліманоўскага. Характар феадальных мясцовых згуртаванняў, моцна зангажаваных у традыцыю, базаваных на сямейных і суседскіх адносінах, абумовіў ахвотнейшае і хутчэйшае самавызначэнне ў катэгорыях літоўскасці, бліжэйшай у адносна замкнёным свеце штодзённага асабістага досведу. Польскасць – асабліва ў яе навачаснай нацыянальнай форме, вышэйшай за ментальнасць «шляхецкай нацыі» – значыла ў пэўнай ступені неабходнасць выйсця за межы мыслення ў лакальных, радавых катэгорыях. Працэс яе прыняцця суправаджаўся адкрыццём рэгіянальнай літоўскасці ў вонкавы свет.

Узняцца над лакальнай групоўкай і станавымі бар'ерамі было значна прасцей пасля адмены прыгону і паразы студзеньскага паўстання – падзей, што гвалтоўна разбуралі ранейшыя грамадскія структуры. Насуперак трываламу прызнанню сваёй літоўскасці, суадносіны «літоўскасць – польскасць» пачалі змяняцца праз паступовае ўзмацненне другога, польскага, складніка. У новых грамадскіх адносінах літоўскасць у традыцыйным разуменні была бар'ерам, які ўсё менеі бараніў групоўку ад распаду, а людзей «літоўскага роду» ад фрустрацыяў і русіфікацыі. Лепшай перашкодай на шляху суцэльнага разбурэння культуры постфеадальнага грамадства і скарэння чужой нацыянальнай ідэалогіі (культурнага кшталту – але пашыранай паліцыйнымі метадамі) сталася ўкараненне катэгорыяў *natione poloni*. Навачасная ідэя польскай нацыі, у процілегласць феадальнай, рэгіянальнай літоўскасці, была таго самага кшталту, што і ідэя расійскай нацыі – такім чынам, канкуравала з ёй[5]. Моўна-культурнае ўзмацненне польскасці значнай часткі тагачасных элітаў суправаджаў адначасовы зварот да палітычнай традыцыі колішняй Рэчы Паспалітай.

Паняцце *gente Lithuanus* значыла на беларускіх землях адмысловае стаўленне да рэлігіі. Памешчыцкая шляхта – згадаем тут прышлых расіян – амаль уся была рыма-каталіцкай (у процілегласць значнай часткі дробнай шляхты, вызнавалай праваслаўе, а да 1839 года – грэка-каталіцтва). Свядомая ў сваёй палітычна-рэгіянальнай літоўскасці і часта ў сваіх этнічна рускіх (беларускіх) і праваслаўных каранях, яна ўспрымала зварот да катэгорый «літоўскага роду» гэтак жа, як і сувязь з мясцовым, праваслаўным сялянствам. Выяўлялася гэта нярэдка ў фінансаванні будаўніцтва уніяцкіх, а пазней праваслаўных святыняў, ва ўдзеле ў царкоўных урачыстасцях.

---

[4] Ліст Т. Касцюшкі да цара Аляксандра I, Вена 10 VI 1815 [2, с. 139].

[5] Падобным чынам рэакцыяй этнічных ліцвінаў, а пазней і беларусаў, на эвалюцыю ранейшага грамадскага укладу і нацыянальную небяспеку быў не зварот да традыцыйнай, палітычна-рэгіянальнай і надэтнічнай літоўскасці – а скліканне ўласных (г. зн. этнічна абумоўленых) навачасных нацыянальных ідэялогіяў (згадаю тут краёвую ідэалогію, да якой схілялася частка выхаваных у польскай культуры элітаў).

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

*Gente Lithuanus*, катэгорыя, якая праз род звязвала шляхту з краем, яго гісторыяй, рэлігіяй, уключала іншую, адметную мясцовую вартасць – мову. Ян Чачот у 1846 годзе пісаў пра беларускую мову, "якой яшчэ жывыя ў нашай памяці бабулькі міжсобку размаўляць любілі, якой дагэтуль гавораць паны і эканомы з сялянамі" [7, с. 5]. Падобна, што пальшчызна пасунула беларускую мову з асяродку сярэдняй шляхты толькі ў перыяд Віленскага Універсітэта і Віленскай Навуковай Акругі, г. зн. тады, калі яна ўспрымалася ў асветніцкім духу, хутчэй як сродак пашырэння асветы, чым як утваральная адметнасць нацыі ў яе навачасным ды этнічным разуменні (гэткія ж працэсы зведалі на пачатку XIX стагоддзя расіяне, якія з дапамогай польскай мовы разлічвалі пышырыць расійскія асветніцкія палітычныя вартасці).

Па-беларуску, аднак, штодзённа размаўляла ладная частка дробнай шляхты, незалежна ад рэлігійнай прыналежнасці. Гэта была мова, карыстаная значнай часткай жыхароў гарадоў і мястэчак (пагатоў, сялянамі). Па-беларуску памешчыкі найчасцей звярталіся да сялян. Так, Аляксандр Ельскі ў 1883 годзе пісаў у пецярбургскі «Край»: "Беларуская гаворка заўсёды была мілай руху і сэрцу ўсіх пластоў тутэйшага грамадства". У гэтым жа тэксце ён паказаў практычны характар беларушчыны: "Шануючы патрыярхальную мову нашага народа, заўжды ёй, а не іншай, карыстаемся ў дачыненнях з народам"[6]. Шляхта ўспрымала гэтую мову як родную, аднак – асабліва на думку памешчыкаў – мужыцкую. Чужынскай лічылася руская мова, і ніколі – беларуская, якая доўга падавалася за дыялект польскай, яе частку і ўсходні працяг. Памешчыкі лічылі беларушчыну мясцовай (краёвай) мовай з правам на далейшае існаванне, не імкнуліся зліквідаваць яе на карысць пальшчызны (спробы такога кшталту, пад канец падзелаў, у XX стагоддзі, ініцыянавалі зусім іншыя грамадскія асяродкі – прамоўцы этнічна-культурнай ідэі нацыі). Калі-нікалі яны здавалі сабе лічбу, што гэта мова іх продкаў, і што некалі яна была афіцыйнай мовай краю, кнігаў і школ. Аднак такое разуменне не было агульным. Калі яно не складала мыслення *Gente Lithuanus* праз зварот да славутых фактаў з гісторыі ўласнага роду, то вызначала яго праз традыцыйную сувязь роду з краем і яго грамадствам.

Стаўленне памешчыкаў да пальшчызны як да штодзённай мовы вынікала з атаясамлення сябе з польскай «шляхецкай нацыяй». Яно было звязана не з *gente Lithuani*, а з катэгорыяй *natione Poloni*. Гэткае стаўленне цягам больш чым стогадовай няволі зазнавала павольную эвалюцыю. Польская мова спачатку ўспрымалася хутчэй утылітарна, як мова грамадскай камунікацыі, праў і вольнасцяў, мова дзяржавы і адукаваных пластоў «шляхецкай нацыі». Аднак разам з эвалюцыяй паняцця нацыі – ад асветніцкага да культурнага – яна пачала рабіцца самадастатковай вартасцю, асноўным элементам нацыянальнай ідэалогіі. "Такім чынам, айчынная мова і літаратура – піша Аляксандр Брукнэр – мусілі замяніць усё тое, што іншым, шчаслівейшым нацыям надавала іх самастойнае палітычнае быццё: мусілі злучаць тое, што падзялілі палітычныя межы..." [цыт. паводле: 9, с. 47].

Небагатая дробная шляхта часам, як і сяляне, вызначала сябе ў хутчэй рэлігійных, чым нацыянальных, катэгорыях. Здаралася, што праз зварот да пальшчызны яна дэманстравала сваю адрознасць ад сялянства, падкрэслівала ўласную шляхецкасць, станавую вышэйшасць. Беларускамоўная ў штодзённасці дробная шляхта ўспрымала польскую як «панскую» і «святочную» мову [10, с. 53], спрабуючы карыстацца ёй у кантактах з людзьмі звонку, з-паза мясцовай групоўкі: з братам шляхцічам, асабліва калі той быў заможным чалавекам ды рэдкім госцем, з гарадскім інтэлігентам, з людзьмі няпэўнага стану і занятку, знешнасць і манера якіх сведчылі аб прыналежнасці да заможных і адукаваных пластоў. Гэтыя людзі належалі да свету недасяжных для сялянства вартасцяў і катэгорыяў мыслення, сувязь з якім дробная шляхта трывала ўсведамляла. Ва ўмовах набліжэння да сялянства, ранейшыя станавыя бар'еры яна спрабавала замяніць польскасцю, актуалізаванай пасля 1905 года.

Паняцце «літоўскага роду, польскай нацыі» закладала гарманічную сувязь літоўскай родавай прыналежнасці з прыналежнасцю да польскасці як да найвышэйшага нацыянальнага

[6] Карэспандэнцыя А. Ельскага ад 12 XI 1883, «Край» 11/23 XII 1883, № 50, цыт. паводле: [8, с. 98] заўвага 512.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

згуртавання. Літвін не мог быць супрацьстаўлены паляку, хутчэй жыхару Кароны, русіну альбо мазуру і вялікапаляку. Усе яны былі палякамі (у тагачасным разуменні польскасці) незалежна ад мовы, вызнання і месца жыхарства. "Ліцвін і Мазур, – пісаў Міцкевіч, – браты; ці ж сварацца браты за тое, што аднаго завуць Уладыслаў, а другога – Вітаўт? Прозвішча ў іх адно: прозвішча Палякаў" [11, с. 80]. Канстанты Рынальда Бароўскі пісаў пра часы студзеньскага паўстання: "Палякамі сярод нас былі пераважна ліцвіны, жмудзіны, падольцы, валынцы і русіны" [цыт. паводле: 12, с. 134]. Азначэнне «паляк» значыла грамадзяніна Рэчы Паспалітай, спадкаемца той часткі даробку польскай дзяржавы, што была супольнай для ўсіх жыхароў незалежна ад этнічных і рэгіянальных падзелаў. Пасля заняпаду дзяржавы гэткі тып мыслення трымаўся даволі доўга. Відавочна, ён не быў элементам свядомасці сялян, якія вызнавалі сябе за ліцвінаў, рускіх, мазураў, тутэйшых... – толькі не палякаў. Гэтае азначэнне мела выразны станавы, «панскі» кантэкст, хаця з часам яго ўсё часцей ужывалі ў дачыненні да сябе (у іншым, аднак, значэнні) сяляне, якія на ўзроўні этнічнай, а не нацыянальнай, свядомасці безумоўна атаясамлялі яго з каталіцтвам, г.зн. зусім не прымалі значэнняў, укаранёных шляхецка-інтэлігенцкімі элітамі.

Паходжанне з «літоўскага роду» не выключала адначасовай прыналежнасці да вузейшай катэгорыі «рускага роду», апошняе азначэнне ўспрымалася як слабейшае і, бадай, неканкурэнтнае адносна першага. Такія элементы культуры *gente Lithuani,* як рэлігія і мова (а хутчэй – рэлігіі і мовы) мелі толькі этнічны, а не нацыянальны характар; яны не былі часткай палітычна-рэлігійнай літоўскасці, над якой стаяла асветніцкае згуртаванне палітычнай польскай нацыі. Памешчыкі былі перакананыя, што разам з сялянамі яны складаюць грамадскую групоўку (хоць на працягу доўгага часу і не нацыянальную), а наяўныя адрозненні вынікаюць са станавых падзелаў, а не чужасці, якая вядзе да вылучэння «іншародцаў» адносна расіян. Такая сістэма сувязяў пачала – асабліва пасля 1863 года – зазнаваць эвалюцыю. Да гэтага, сярод іншага, спрычыніўся заняпад значэння шляхты ў грамадстве і напаўненне ідэі нацыі культурным зместам.

Апісаную тут тэрміналагічную сістэму давялося падаць з пэўным спрашчэннем. Цягам XIX стагоддзя яна падлягала эвалюцыі, рознай на ўзроўнях паасобных пластоў. Змястоўны абсяг пэўных тэрмінаў таксама не заўсёды аднолькава ўсімі разумеўся. У некаторых асяродках перыядычна ўзмацняліся сепаратысцкія настроі (напрыклад, развядзенне літоўскасці і польскасці), перанятыя яшчэ з І Рэчы Паспалітай і таксама напоўненыя новым, этнічна-нацыянальным, зместам [6, с. 204–205].

Утваральнымі і разам з тым размежавальнымі рысамі для новых на тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага нацый сталіся рэлігія (якая вылучала беларусаў з палякаў) ды мова (якая разводзіла польскасць і літоўскасць). Былы обер-пракурор Віленшчыны пісал аб стаўленні памешчыкаў на падначаленых яму землях перад 1905 годам: "Гаспадары, што апыналіся ў эканамічна цяжкім стане, атрымлівалі ад суседзяў усё, калі былі каталікамі, нічога – калі былі праваслаўнымі" [13, с. 94]. На яго думку, таемным навучаннем польскіх дзяцей "прышчаплялася ідэя польскай дзяржавы, непарыўна звязанай з каталіцызмам" [13, с. 94]. Таемнае навучанне ды рознага кшталту асветныя акцыі ладзіліся ад васьмідзесятых гадоў XIX стагоддзя сярод розных грамадскіх пластоў, закраналі і этнічна няпольскае насельніцтва (пераважна каталіцкае). Значны ўдзел у гэтым браў Касцёл, уносілі сваю долю і памешчыкі. З канца XIX стагоддзя польская асветная дзейнасць вялася на літоўска-беларускіх землях у значнай ступені пад уплывам Нацыянальнай Дэмакратыі [8, с. 21–22].

Для палякаў пераход ад палітычнай да культурнай нацыі нёс небяспеку значнага абмежавання нацыянальнай групоўкі паводле тэрыторыі і насельніцтва, што вяло да ўзмацнення нацыянальных фрустрацый і грамадскіх канфліктаў. Нацыянальная Дэмакратыя была праявай пераможнага ў той частцы Еўропы нацыянальнага трэнду. Пашыраны яе высілкамі нацыяналізм (выразны на беларускіх землях толькі з 1905 году) у пэўнай ступені можна разглядаць як рух, выкліканы лозунгамі іншых нацыянальных супольнасцяў на землях былой Рэчы Паспалітай, разбурэннем палітычнай польскай нацыі і саслабеннем польскасці ў гістарычным, традыцыйным значэнні – г.зн. як рэакцыю на царскую палітыку

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

русіфікацыі. Падобнымі былі передумовы венгерскага нацыяналізму, у супрацьлегласць нацыяналізмам заходнім (напрыклад, французскаму ды англійскаму), адрозным ад сярэднееўрапейскіх сваім зместам, а таксама нацыяналізмам маладых сялянскіх нацый. Іншую глебу меў расійскі нацыяналізм. Падмурак расійскай нацыянальнай актыўнасці на ўсходніх землях былой Рэчы Паспалітай (як і ў іншых мясцовасцях, заваяваных расіянамі) складала ідэя захопу (спачатку тэрытарыяльнага, палітычнага, пасля культурнага). Яна прадвызначыла змест расійскага гатунку нацыяналізму. Палякі лічылі спадчыннікамі дзяржавы абедзве нацыі і дамагаліся «Крэсаў». Украінцы агучвалі прэтэнзіі да абшару, вылучанага паводле этнаграфічнай пракметы, уключаючы туды ж паўднёва-прыморскую, некалі татарскую, а пазней рускамоўную частку краю – падобна як у ХХ стагоддзі беларусы ўхвалялі прыналежнасць да Беларусі ўкраінамоўнай часткі Палесся. Ліцвіны ж спрабавалі спалучыць ідэю культурнай (моўнай) і палітычнай нацыі, апелюючы да тэрыторыі былой літоўскай дзяржавы, прынамсі, яе колішняга літоўскага этнічнага абшару, падлеглага з часам частковай беларусізацыі і паланізацыі.

Змены, якія адбыліся ў грамадскай структуры, вызваленай ад феадальных, станавых абмежаванняў, выразна паўплывалі на ўзнікненне і пашырэнне культурнай канцэпцыі нацыі, разгорнутай нацыянальнымі дэмакратамі – з такімі вызначальнікамі прыналежнасці да польскай нацыі, як мова і каталіцтва. Ідэя культурнай нацыі была падтрымана грамадскімі пластамі, што імкліва развіліся ва ўмовах індустрыялізаванай і ўрбанізаванай, але папранейшаму палітычна кансерватыўнай Сярэдне-Усходняй Еўропы: інтэлігенцыяй, гараджанамі, вызваленым урэшце сялянствам. Яны прынялі, вядома, не ранейшыя катэгорыі шляхецкай нацыі, а зноў жа ўзятую з Асветніцтва навачасную, надэтнічную ідэю палітычнай нацыі [гл. 1]. Такім чынам была прадвызначана новая нацыянальная форма гэтай часткі кантынента. Пашыраная нацыянальнымі дэмакратамі нацыянальная ідэалогія абумовіла знікненне двухступеннай сістэмы нацыянальных сувязяў, саслабіла повязі паміж рэгіянальнымі групоўкамі. Нацыянальныя дэмакраты рашуча перамагалі тутэйшасць. Яны імкнуліся да ўзнікнення на ўсходзе нацыянальна (культурна) свядомай польскай грамадскасці, якая б цалкам атаясамляла сябе з польскай нацыяй на захад ад Буга. Іх дзейнасць, безумоўна, паспрыяла ўзмацненню нацыянальнай свядомасці сярод народных масаў, але і абумовіла канфлікты на сутыччы палякі – беларусы (ліцвіны). Уздым нацыянальнай актыўнасці этнічных супольнасцяў вёў альбо да іх паланізацыі, альбо да супрацьстаяння польскасці. Гэткім чынам узмацнялася культурнае разуменне нацыі сярод іншаэтнічных сялянскіх грамадскасцяў. Іх этнічныя адметнасці ў значна большай, чым раней, ступені ўспрымаліся як бар'еры паміж супольнасцямі.

На працягу XIX стагоддзя эліты беларускіх земляў *gente Lithuani (Rutheni), natione Poloni* культурай і складам нацыянальнай свядомасці хутчэй набліжаліся да кангрэсавых эліт, чым аддаляліся. Разгляданыя Паўлам Боскім (паводле Г. Тайфеля) крытэрыяльныя атрыбуты нацыянальнай ідэнтычнасці, належныя абсягу культурных сімвалаў (г. зн. элементаў, вызначальных для межаў нацыянальнага згуртавання, напр., Язэп Пілсудскі, Ясна Гура), у абедзвюх супольнасцях розніліся неістотна. Крытэрыяльныя для нацыянальнай ідэнтычнасці культурныя сімвалы ўвогуле іх не разводзілі[7]. Мар'ян Здзяхоўскі (нарадзіўся ў 1861 г., паходзіў з мінскіх памешчыкаў) пісаў ва ўспамінах аб сваёй маладосці: "Нацыянальна размаіты наш край складае частку гістарычнай Літвы, і нас, людзей майго пакалення, выхоўвалі як ліцвінаў, у тым самым значэнні, у якім ім быў Міцкевіч, калі казаў: "Літва, мая айчына! " У дзяцінстве мяне навучалі, разам з гісторыяй Польшчы, гісторыі Літвы; таму нацыянальнымі героямі лічу не толькі тых, хто ўзводзіў Польшчу, але і таго, хто задумаў адарваць Літву ад Польшчы – Вялікага князя Вітаўта. Хто ж, аднак, тады над той непаслядоўнасцю не задумваўся." [15, с. 3]. Пакуль эліты земляў са складу колішняй Рэчы

[7] "Вось жа канфлікт крытэрыяльных ідэнтычнасцяў– піша Боскі – гэта канфлікт ідэалагічны, «сімвалаў». Ён можа ўвогуле разгарэцца на памежжы дзвюх нацыяў, дзе «нашыя» героі ёсць «вашымі» паразамі ды інш. Такія канфлікты з'яўляюцца гістарычнай спадчынай і ствараюць умовы набыцця другаснай ідэнтычнасці; прыкладаў польска-нямецкага і польска-расійскага памежжа з гэтага гледзішча больш чым дастаткова" [14, с. 140–141].

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

Паспалітай сумесна апелявалі да палітычнай спадчыны гэтай дзяржавы і надэтнічнай катэгорыі нацыі, постаць князя Вітаўта не падзяляла іх і не разводзіла. Пра яго больш памяталі ў Вільні ды ў Мінску, чым у Варшаве. Аднак ворагам у вачах грамадзян Кангэсавага Каралеўства ён не быў. Ступень шанавання ягонай памяці вынікала з рэгіянальных адрозненняў. Працэс змены гэтай сітуацыі цягнуўся дзесяцігоддзямі і сведчыў пра з'яўленне сялянскіх этнічных нацыяў – літоўскай і беларускай, а таксама пра прыняцце культурна-этнічных катэгорыяў польскасці. Для літоўскіх нацыяналістаў Вітаўт стаў нацыянальным героем, а Ягайла здраднікам. Працэс стварэння ўласнай нацыянальна-адметнай сімволікі паўстаў у беларусаў пераважна пасля 1905 года.

У прынцыпе, аднак, ён не закрануў у XIX стагоддзі эліт «роду літоўскага (рускага), нацыі польскай». Іх польскасць (што зазнавала небяспеку) была блізкай да «кангрэсавай» польскасці, але не тоеснай той. Гэта значыць, казаць пра розныя крытэрыі нацыянальнай ідэнтычнасці прадстаўнікоў польскай грамадскасці па розныя бакі Буга не выпадае. Гэтая сітуацыя не датычыла, аднак, сацыяльна вылучаных прадстаўнікоў дробнай праваслаўнай (некалі уніяцкай) шляхты, якая ў працэсе вылучэння часта падлягала культурнай і нацыянальнай русіфікацыі. Няма дастатковых звестак для апісання нацыянальнай свядомасці масаў дробнай праваслаўнай шляхты, узроўнем матэрыяльнага побыту часта неадрознай ад суседзяў-сялян. Падобна, што з-за нястачы і нізкага ўзроўню адукацыі тая грамадскасць гуртавалася хутчэй вакол сваёй традыцыйнай шляхецкасці (якая адрознівала яе ад сялян), чым вакол адназначных нацыянальных опцыяў у навачасным разуменні.

Затое карэляцыйныя атрыбуты маюць трывалы расклад. Яны датычаць вартасцяў са ступенямі выяўлення. Асобныя групы характарызуе не факт наяўнасці, а ўзровень інтэнсіўнасці такіх вартасцяў. Адрозненні карэляцыйных тоеснасцяў прадстаўнікоў розных соцыумаў могуць выяўляцца ў розных стылях жыцця [14, с. 14–141]. Так было ў выпадку дзвюх польскіх супольнасцяў, адрозных агульнапрынятымі паводзінамі, што сведчыла пра няпоўнае супадзенне культурнай іерархіі вартасцяў. Якуб Гейштар, згадваючы свой візіт у Варшаву і самотна праведзеную Вігілію Божага Нараджэння ў снежні 1862 года, піша, што пасля таго досведу "засталася памяць пра негасціннасць нашых братоў з Кароны, і прысягаю, што ў Вільні нічога падобнага не спаткала б жыхара Кароны ў тым становішчы, у якім я завітаў да Варшавы" [16, с. 198]. Жыхары гістарычнай Літвы, задаволеныя сваім рэгіяналізмам, са спрыяльнейшымі, чым у Кангрэсавым Каралеўстве, умовамі для развіцця прамысловасці, увогуле не супрацьстаўлялі Варшаве ўласных герояў ды культурных элементаў, якія меліся б ізаляваць іх (нацыянальна, а не рэгіянальна) ад суседзяў з захаду – але апелявалі да сваёй ментальнай спецыфікі, лепшасці, выяўленай, напрыклад, у шчыльнейшых міжасабовых сувязях. Гэтае пачуццё супольнасці палякаў былога Вялікага Княства Літоўскага (час ад часу, што праўда, цішэйшае), вынікала яшчэ і з усё большага ўсведамлення сваёй меншасці адносна праваслаўнага народа (хаця баранілася ад пачуцця чужынства адносна яго) і расійскай улады.

**Abstract.** Three trends of the evolution of self-consciousness of the Polish community on the Belarusian lands in the 19$^{th}$ century (transition from the self-consciousness of the "Lithuanian (Russian) origin, but of the Polish nation to the self-consciousness of the Polish nationalist; from the minor (local) and regional motherland to the modern ideological Motherland; from the political nation to the cultural nation) are considered in the paper.

## Літаратура

1. Фармаванне нацыяў у Цэнтральна-Усходняй Еўропе ў канцы XVIII – пачатку XX ст. // Беларусь і суседзі: гістарычныя шляхі, узаемадзеянне і ўзаемаўплывы, Гомель. – 2006.

2. Wielhorski, W. Litwini, Białorusini i Polacy w dziejach kultury Wielkiego Księstwa Litewskiego / W.Wielhorski // Alma Mater Vilnensis. – t. II, Londyn, 1951.

3. Bardach, J. Polacy a narody Litwy historycznej – próba analizy systemowej / J. Bardach //

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

Kultura i Społeczeństwo, 1994. – nr 2.

4. Бобровский, П. Можно ли одно вероисповедание принять в основание племенного разграничения славян западной России? (По поводу этнографического атласа западно-русских губерний и соседних областей Р. Ф. Эркерта) / П. Боборовский. – С. Петербург, 186- (Из № 75 и 80 Русск. инв.)

5. Woyniłłowicz, E. Wspomnienia 1847–1928 / E. Woyniłłowicz. – Wydał, wstępem i przypisami opatrzył J. Iwaszkiewicz, cz. 1. – Wilno, 1931.

6. Bardach J. O świadomości narodowej Polaków na Litwie i Białorusi w XIX–XX wieku / J. Bardach // O dawnej i niedawnej Litwie. – Poznań, 1988.

7. Piosnki wieśniacze znad Niemna i Dźwiny, niektóre przysłowia i idiotyzmy, w mowie sławiano-krewickiej, spostrzeżeniami nad nią uczynionymi. – Wilno, 1846, s. V.

8. Jurkiewicz, J. Rozwój polskiej myśli politycznej na Litwie i Białorusi w latach 1905–1922 / J. Jurkiewicz/ – Poznań, 1983.

9. Tazbir, J. Procesy polonizacyjne w szlacheckiej Rzeczypospolitej / J. Tazbir // Kultura i Społeczeństwo, 1987. – nr 1.

10. Korzeniewski, B. Było, minęło, nie wróci / B. Korzeniewski // Wspomnienia mówione – cz.1, „Znak" 1988, nr 11.

11. Mickiewicz, A. Księgi narodu polskiego i pielgrzymstwa polskiego / A. Mickiewicz. – r. XII, Warszawa, 1986.

12. Wapinski, R. Polska i małe ojczyzny Polaków. Z dziejów kształtowania się świadomości narodowej w XIX i XX wieku po wybuch II wojny światowej / R. Wapiński. – Wrocław, 1994.

13. Sukiennicki, W. Wilno na schyłku rządów carskich. Memoriał rosyjskiego oberprokuratora / W. Sukiennicki // Zeszyty Historyczne. – Paryż. 1974.

14. Boski, P. Studia nad tożsamością narodową Polaków w kraju i na emigracji: zmiany w składnikach kryterialnych i korelatywnych / P. Boski // Kultura i Społeczeństwo. –1991. – nr 4.

15. Zdziechowski, M. Idea polska na Kresach / M. Zdziechowski // Tragedia Kresów. – Warszawa, 1989.

16. Gieysztor, J. Pamiętniki Jakuba Gieysztora z lat 1857–1865 / J. Gieysztor . – Wilno, 1913.

Институт социологии
Университета Марии Кюри-Складовской
г. Люблин

Поступило 16.06.08

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ